ЗАРА над ДРУЦЦЮ

Орган Бялыніцкага раённага Савета дэпутатаў і райвыканкама

СУБОТА
6
МАЯ
№ 35 (8546)
2000 года
Цана 25 руб.

Выдаецца з 1931 года

НАВЕКІ СЛАВА ТЫМ, ШТО Ў ПОЛІ РАТНЫМ ЗАГІНУЛІ ЗА РОДНЫЯ ПАЛІ, ЗА НАШ НАРОД, ЗА ЛЁС НАРОДАЎ БРАТНІХ, ЗА ДЗЕНЬ НАСТУПНЫ НА ЗЯМЛІ

Дайшоў салдат да Берліна. Ззаду засталіся папялішчы Хатыні, Стэфанова і соцень такіх жа вёсак, якія былі спалены разам з яе жыхарамі, залітая крывёю родная зямля. Засталіся ззаду брацкія магілы баявых сяброў, якіх кожны дзень траціў ён на гэтым доўгім і цяжкім шляху.

Дайшоў салдат да Берліна і ўбачыў на вуліцы чатырохгадовага хлопчыка. Узяў на рукі. Прыгалубіў, пацалаваў. І, даведаўшыся, што гэта сірата, вельмі захацеў усынавіць. Але адна з жанчын, якая стаяла побач са сваімі дзецьмі, паківала галавою: гэта мой пляменнік.

Засмуціўся салдат, уздыхнуў, апусціў хлопчыка на зямлю і пачаў развязваць рэчмяшок. Іншыя байцы таксама нахіліліся над сваімі торбамі і ў нясмелыя дзіцячыя рукі сталі пераходзіць салдацкія пайкі: хлеб, сухары, цукар, кансервы...


Якія ж чулыя душы трэба было мець, каб боль і гнеў, лютасць і нянавісць не зацямнілі разумнае: гэта дзеці — таксама ахвяры вайны. Такім быў наш салдат, салдат-пераможца!

Красавіцка-майская чарада святаў і памятных датаў завяршаецца, як звычайна, бадай, самым святым з іх — Днём Перамогі. 9 мая, вось ужо ў 55-ы раз, мы шчыра і сардэчна павіншуем з ім сваіх бацькоў, маці, дзядоў і бабуль — былых франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў, працаўнікоў тылу і скажам ім вялікі дзякуй за іхнюю ратную баявую справу.

55 гадоў — зусім няшмат для гісторыі. На вялікі жаль, усё менш і менш застаецца сярод нас тых сапраўдных герояў Вялікай Айчыннай вайны, якія выратавалі свет ад "карычневай чумы". Яны закрывалі сабой амбразуры, ішлі на таран варожых самалётаў ці зусім ціха гінулі ў гарачых баях...

Нізкі паклон вам, ветэраны!

6—9 мая у нашым раёне будзе ўрачыста адзначацца сапраўднае ўсенароднае свята — Дзень Перамогі. Перамогі святла над цемрай, дабра — над злом, чалавечнасці — над нелюдствам... Абдымем жа і павіншуем сівых ветэранаў! Яны — наша гордасць, наша багацце! Здароўя вам, удзельнікі Вялікай Айчыннай! Дзякуй вам!



У гады Вялікай Айчыннай вайны камандзіру аддзялення супрацьтанкавых ружжаў Канстанціну Міхайлавічу Шчамлёву і стралку Мікалаю Іосіфавічу Качанюку давялося ваяваць на розных франтах. Але шлях абодвух да Вялікай Перамогі быў цяжкім і церністым. І кожны з іх унёс сваю лепту ў перамогу над фашысцкімі захопнікамі. Сёння ветэранам ёсць аб чым успомніць, ёсць каго памянуць за святочным сталом.

У мірны час Канстанцін Міхайлавіч і Мікалай Іосіфавіч сумленна працавалі на карысць Радзімы. Першы – на ніве народнай адукацыі, другі – вадзіцелем.

***

НА ЗДЫМКАХ: К.М. Шчамлёў (на фота злева) і М.І. Качанюк.
Фота В. РАДОЎСКАГА.



Віншуем!

ПАВАЖАНЫЯ ВЕТЭРАНЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ – ФРАНТАВІКІ, ПАРТЫЗАНЫ І ПАДПОЛЬШЧЫКІ, ПРАЦАЎНІКІ ВАЕННАГА ТЫЛУ!
ДАРАГІЯ ЗЕМЛЯКІ-БЯЛЫНІЧАНЕ!

Раённы выканаўчы камітэт і раённы Савет дэпутатаў ад усяе душы віншуюць вас з вялікім усенародным святам — Днём Перамогі!

55 год аддзяляюць нас ад светлага дня 9 мая 1945 года, калі ўрачысты салют апавясціў аб Вялікай, доўгачаканай Перамозе над фашызмам.

Вялікая Айчынная вайна пакінула ў памяці жыхароў раёна вечны боль за бязмежныя пакуты, якія выпалі на долю нашага народа. Гарэла зямля пад нагамі акупантаў ад смелых і рашучых удараў партызан і падпольшчыкаў Прыдруцкага краю. У радах народных мсціўцаў змагаліся тысячы нашых землякоў. Больш 10 тысяч бялынічан ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, вызвалялі Прыбалтыку, родную Беларусь, Польшчу, Югаславію, Чэхаславакію і Венгрыю, бралі Берлін. Нашы землякі ўдзельнічалі ў парадзе Перамогі ў 1945 годзе.

Кожны трэці жыхар раёна аддаў сваё жыццё ў імя шчасця і свабоды тых, хто жыве сёння. Няма сям'і ў нашым краі, якая б не панесла страт родных і блізкіх, франтавых сяброў.

У гэты, напоўнены велічу і смуткам дзень, мы схіляем галовы перад светлай памяццю нашых землякоў, суайчыннікаў, родных і блізкіх, якія загінулі ў барацьбе з агрэсарам. Не знайсці такіх слоў, каб да канца выказаць удзячнасць нашым жанчынам-бялынічанкам, якія вынеслі на сваіх плячах страшэнны цяжар вайны.

Вялікі дзякуй усім тым, хто аднаўляў з руін і попелу прадпрыемствы і гаспадаркі раёна, адбудоўваў наш край.

У пярэдадзень гэтага вялікага свята нашы сэрцы зноў і зноў перапаўняюць пачуцці жывой сувязі часоў, гераічных ратных і працоўных традыцый, якія аб'ядноўваюць сённяшняе і мінулае. Гэтай Перамозе мы абавязаны жыццём, магчымасцю мірна працаваць, выхоўваць дзяцей.

Мы верым у светлае будучае сваіх дзяцей, тых, хто будзе захоўваць у сэрцах слаўную памяць аб Вялікай Перамозе ўжо ў XXI стагоддзі.

Са святам вас, дарагія землякі! Здароўя, шчасця і доўгіх год жыцця. Дабрабыту вам, вашым родным і блізкім. Няхай неба над родным краем будзе мірным, светлым і чыстым!

ДОРОГИЕ ЗЕМЛЯКИ, ВЕТЕРАНЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ!

55 лет отделяют нас от того радостного весеннего дня, когда народ с ликованием воспринял долгожданную весть о Великой Победе.

Не будет преувеличением сказать, что 9 мая 1945 года вошло в летопись уходящего столетия одной из самых ярких и знаменательных дат. Этот праздник сегодня отмечают не только в республиках бывшего Советского Союза, но и во многих государствах Европы, подвергшихся фашистскому нашествию и избежавших порабощения только благодаря бессмертному подвигу народов СССР, в том числе и белорусского народа.

Тяжелые, невосполнимые потери понесла Беларусь в той страшной войне. Память о ней до сих пор отзывается болью в каждой белорусской семье.

В этот день мы скорбно склоняем головы перед светлой памятью павших на полях сражений и погибших в фашистских застенках, ценой своей жизни приблизивших долгожданную Победу над врагом.

Перед всеми вами, павшими и живыми, прошедшими трудными дорогами войны на фронтах и в партизанских отрядах, отстоявшими свободу и независимость нашей Родины, нынешние и грядущие поколения в неоплатном долгу.

День Победы — это в первую очередь ваш праздник, дорогие ветераны. От всей души поздравляю вас с этим светлым праздником и желаю вам, вашим родным и близким, вашим детям, внукам и правнукам крепкого здоровья, бодрости духа, жизненного оптимизма и стойкости. Пусть небо над вашими домами будет всегда мирным, а в домах царит достаток и благополучие.

С праздником Великой Победы, дорогие ветераны!

Заместитель Председателя Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь
В. КОНОПЛЕВ.


ПЕРЕД БОЕМ

Враг за темной рекой.
Не ложимся мы спать:
Нам приказ ведь такой —
Оборону взломать!
Пишет письма комбат,
И солдаты строчат:
Все легко у ребят,
Не желают стращать.
Письма в сумку кладем,
Только юный чудак
Все сидит над письмом,
Не закончит никак.
Полковой почтальон
Понесет их с зарей
В наш почтовый вагон,
Мы же ввяжемся в бой.
Письма наши тотчас
Поезда развезут,
А кого-то из нас
Под звездой поклядут!

Олег ПЛИНДОВ,
ветеран Великой Отечественной войны.

ВАЙНА Ў ЛІЧБАХ І ФАКТАХ

- Амаль кожны трэці беларус загінуў у полымі вайны.
- У пачатку ліпеня 1942 года бялыніцкая зямля стала арэнай жорсткіх баёў. Праз тэрыторыю нашага раёна прабівалася з акружэння стралковая дывізія генерала Русіянава. Навекі пакрылі славай воіны 4-га паветрана-дэсантнага корпуса генерала Жданава ў баях на рубяжы рэк Ослік і Друць, пад Карытніцай.
- Усяго за час акупацыі загінула больш 3300 мірных жыхароў нашага раёна.
- Фашысты здзекваліся над сем'ямі падпольшчыкаў і партызан 600-га партызанскага атрада. Аднойчы яны пад дуламі аўтаматаў сагналі ўсіх жыхароў вёскі В. Трылесін. Сюды прывезлі 7 партызанскіх сем'яў і ўсіх іх расстралялі.
- У снежні 1942 года за сувязь з народнымі мсціўцамі гітлераўцы спалілі вёску Стэфанова разам з яе 95 жыхарамі. Толькі аднаму Раману Гарбачэўскаму ўдалося тады не трапіць у рукі катаў.
- На бялыніцкай зямлі загінулі камандзір 121-га партызанскага атрада Асман Касаеў, капітан Б.Л. Хігрын, партызан Л. Лорчанка, старшы лейтэнант С.В. Цэрашкевіч, якія за мужнасць і адвагу пасмяротна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.



РАЎНЕННЕ НА ПОДЗВІГ

Старонка ваенна-патрыятычнага выхавання

● САЛДАТЫ МІНУЎШАЙ ВАЙНЫ

„Мне часта сняцца хлопцы тыя, сябры маіх ваенных дзён...”

У Крупках часта можна было заўважыць невысокага хударлявага юнака. Тут ён сустракаўся з начальнікам мясцовай паліцыі, ад якога атрымліваў усе неабходныя звесткі — аб руху варожых цягнікоў, умацаванні паліцэйскіх гарнізонаў і іншыя. Пасля спакойна вяртаўся ў Сіманавіцкі лес да сваіх сяброў-партызанаў з брыгады Жуніна. Звалі хлопца Дзяніс Ганчароў.

Колькі было на яго рахунку такіх паходаў, не падлічыць. Дарэчы, адзін з іх ледзь не закончыўся для юнака трагедыяй. У той раз Дзяніс, апрача звыклага кошыка з яйкамі, прыхапіў з сабою яшчэ і дзве магнітныя міны, якія напярэдадні знайшоў са сваім сябрам у разбітым фашысцкім самалёце. З гэтай паклажай накіраваўся ў Крупкі акурат да нямецкай камендатуры. Заўважыўшы там варожую машыну, вырашыў падарваць яе. Устанавіў рэгулятар на міне на 30 хвілін. Аднак толькі сабраўся прыляпіць міну да кузава, як заўважыў на тратуары нямецкага оберлейтэнанта. Той спыніўся ля машыны і, па ўсім відаць, нікуды не спяшаўся. Чакаць было вельмі небяспечна, бо да выбуху заставаліся лічаныя хвіліны. На шчасце, Дзяніс удалося вылучыць зручны момант і непрыкметна падкрасца да машыны...

Неўзабаве раздаўся моцны выбух. У камендатуры ўзнялася страшэнная мітусня. А юны падрыўнік у імгненне вока сіганў праз плот. Праўда, далёка ўцячы не змог, бо тут жа быў затрыманы паліцаем і дастаўлены ў камендатуру.


Пры вобыску ў Дзяніса ў кішэні знайшлі яшчэ адну міну. Юнаку ўчынілі допыт. "Хто? Адкуль? Дзе партызаны?" Дзяніс упарта маўчаў. Паспрабавалі каты "паразмаўляць" з хлопцам інакш: збівалі, выкручвалі пальцы на руках, заганялі пад пазногці іголкі. Але ўсё роўна не пачулі ад яго ні слова. На другія суткі непрытомнае цела кінулі ў падвал.

Выратаваў падлетка ўсё той жа начальнік паліцыі, які западозрыў нешта нядобрае, калі хлопец не з'явіўся на сустрэчу ў дамоўлены час. Адшукаў свайго сувязнога ў камендатуры і ноччу дапамог яму ўцячы...

Відаць, Дзяніс Іосіфавіч Ганчароў належыць да тых людзей, волю якіх зламаць немагчыма. Пасля ўцёкаў з палону ён зноў вярнуўся ў атрад, бо ведаў, што барацьба з ворагам для яго яшчэ не завершана.

У 1944 годзе Дзянісавы сябры-аднавяскоўцы Рыгор Скубілаў і Рыгор Ганчароў, з якімі юнак разам пайшоў партызаніць, засталіся на радзіме, у вызваленым ад акупантаў Лубяным. Вырашылі працягваць вучобу ў школе міліцыі. А Дзяніс паўтарае адно — на фронт, да перамогі.

Фарсіраванне ракі Нарва, вызваленне гарадоў Мельзак і Варамдзіт, штурм Кенігсберга і, нарэшце, Берліна — вось толькі асобныя вехі франтавога шляху Д. І. Ганчарова, байца 290-й Магілёўскай Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава другой ступені пяхотнай дывізіі.



У сваім палку Дзяніс Іосіфавіч займеў рэпутацыю чалавека бясстрашнага і смелага. А пасля аднаго бою, які назаўсёды захаваўся ў памяці Дзяніса Іосіфавіча, аднапалчане нараклі свайго юнага таварыша бессмяротным кулямётчыкам...

Захоплены боем, старшы сяржант Дзяніс Ганчароў адразу і не заўважыў, што на вышыні, якая цяпер, як і тысячы іншых, завецца безыменнай, з жывых застаўся толькі ён адзін. У некалькіх кроках ад сябе ўбачыў свайго памочніка, які так і застыў на дне акопа з прыадчыненай скрынкай у руцэ. А гітлераўцы зноў кінуліся ў атаку.

Дзяніс страляў, пакуль не скончыліся патроны. А шарэнгі атакуючых усё гусцелі. Выручыла скрыня гранат, што загадзя прыпаслі на ўсялякі выпадак кулямётчыкі.

За гэтым няроўным боем з камандная пункта пільна сачыў у бінокль камандзір дывізіі. Заўважыўшы, што працінік амаль авалодаў вышыняй, ён загадаў артдывізіёну адкрыць агонь. І па вышыні ўдарылі "кацюшы", раз і назаўсёды адбіўшы ў ворага ахвоту наступаць.

Уражаны беззапаветнай храбрасцю і стойкасцю невядомага кулямётчыка генерал распарадзіўся знайсці яго і пахаваць з усімі воінскімі ўшанаваннямі. Якое ж здзіўленне і адначасова захапленне з'явілася на тварах аднапалчан, калі яны апынуліся ля агнявой кропкі кулямётнага разліку Ганчарова. Старшы сяржант Дзяніс Ганчароў, паўзасыпаны зямлёй, моцна сціскаў у руцэ апошнюю гранату, якую берог на самы крайні выпадак, для сябе. А перад ім было поле, услане трупамі гітлераўцаў. І самае дзіўнае, што на целе байца, як і ў папярэдніх баях, не аказалася ніводнай драпіны. За гэты бой Дзяніс Іосіфавіч і атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі.

А. НЕКРАШЭВІЧ.

***

НА ЗДЫМКУ: Д.І. Ганчароў.
Фота В. РАДОЎСКАГА.

"Да, пали они, нам выпало жить..."

На фронце я ваяваў у складзе 450 палка 42-й Смаленскай Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава стралковай дывізіі, якая, дарэчы, вызваляла і наш раён. У снежні 1944 года полк наш атрымаў заданне правесці разведку боем у магчымым напрамку галоўнага наступальнага ўдару нашых войскаў пасля працяглай восеньскай абароны ў раёне Ломжы і Астраленкі. Ноччу, ціха фарсіраваўшы раку Нарэў, мы пайшлі ў наступленне і з боем занялі тры лініі глыбокай абароны праціўніка. Але і вораг не драмаў. Больш двух сутак мы стрымлівалі яго контратакі. Да таго ж фашысты здолелі падцягнуць сюды буйныя рэзервы з тылу. Як потым высветлілася, мы тым самым адцягнулі іх на сябе, дазволіўшы савецкім войскам, у прыватнасці II Беларускаму фронту, перайсці ў генеральнае наступленне.

А на той час выпрабаванне на лёс байцоў палка выпала непагоднае. Немцы, накіроўваючы ўвесь агонь на нашы пазіцыі, пачалі паступова адцясняць нас да ракі, тым больш, што сілы былі далёка не роўныя. Пантонныя лодкі ледзь не ўсе былі знішчаны, адступаўшых байцоў фашысты расстрэльвалі амаль ва ўпор.

Мне пашанцавала ў гэтым баі. Паспеўшы скінуць бушлат, я ўчапіўся ў праплываўшае побач бервяно, якое, на шчасце, і прыцягнула да берагу.

У той дзень мы не далічыліся многіх сваіх таварышаў, якія і сёння жывуць у маёй памяці. Загінулі і трое маіх сяброў — Міхаіл Салановіч з Магілёва, Антон Тумар і Антон Шлык з Круглянշчыны.

Полк наш задачу выканаў, але мы засталіся без свайго камандзіра палка палкоўніка Казлова, якога цяжка паранілі. Неўзабаве яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, а яшчэ праз нейкі час ён зноў вярнуўся ў родны полк. Не забыліся і аб нас, простых салдатах. Я, у прыватнасці, быў адзначаны медалём "За адвагу".


А яшчэ я хацеў бы прапанаваць вашай увазе свой сціплы верш, які, адпак, напісаны ад душы і прысвечаны загінуўшым сябрам. Назваў я яго

СОЛДАТСКАЯ ВЕРНОСТЬ

Как будто вчера отгремела
война:
До боли мы помним, как все это
было...
На правую битву поднялась
страна
В могучем порыве и фронта,
и тыла.
Свободу ее, как могли,
защищали
В жестоких сраженьях Великой
войны.
На верность, Отчизна, тебе
присягали
И этой присяге остались верны.
С боями прошли мы сквозь
грозные годы,
К Победе наш путь был суров
и тяжел.
Борясь и мужаясь, сносили
невзгоды,
Не каждый из нас до Берлина
дошел.
По доброй традиции рюмки
поднимем.
Да, пали они, нам выпало жить.
И выпьем за тех, кто дал
мирное небо,
Пока мы живем — нам друзей
не забыть.

С. СНЫТКО,
інвалід Вялікай
Айчыннай вайны.

Мы вас ніколі не забудзем:
Ні праз гады, ні праз вякі



Пра Івана Антонавіча Грышанава ў раёне больш ведаюць, як аб адметным працаўніку, брыгадзіру адной з лепшых у 60-80-я гады брыгад калгаса імя Леніна. Нездарма за высокія дасягненні ў працы Радзіма ўзнагародзіла яго ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Акрамя таго, Іван Антонавіч адзначаны таксама сям'ю залатымі медалямі ВДНГ СССР.

Між тым, за плячыма І.А. Грышанава і суровыя выпрабаванні мінуўшай вайны. У складзе войскаў II Украінскага фронту ён прымаў удзел у жорсткіх баях, вызваляў Заходнюю Еўропу ад „карычневай чумы". За мужнасць і адвагу ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, медалямі „За адвагу", „За ўзяцце Вены", „За перамогу над Германіяй".

НА ЗДЫМКУ: І.А. Грышанаў.

Фота В. РАДОЎСКАГА.

ТРЫ РАНЕННІ — ТРЫ МЕДАЛІ „ЗА АДВАГУ"

„...У перыяд знаходжання ў 3-й стралковай роце і за час баявых дзеянняў праявіў сябе мужным, адважным, стойкім... Дысцыплінаваны, патрабавальны да сябе, сярод таварышаў карыстаецца аўтарытэтам, да ўсіх сваіх абавязкаў адносіцца добрасумленна... З'яўляецца дастойным воінам Чырвонай Арміі. Аддана справе партыі Леніна, Сталіна.

Камандзір 3-й стралковай роты гвардыі капітан Шастакоў."

(З баявой характарыстыкі снайпера 3-й стралковай роты 219 гвардзейскага стралковага Полацкага Чырванасцяжнага ордэна Кутузава 3 ступені палка гвардыі яфрэйтара Накава Аркадзя Якаўлевіча.)

Гэты пажаўцелы ад часу дакумент Аркадзь Якаўлевіч захоўвае як каштоўную святыню, як напамін аб тых далёкіх днях, калі ён 18-гадовым юнаком адважна змагаўся з ворагам на фронце.

А. Я. Накаў — адзіны ў раёне ветэран, які ў гады вайны атрымаў ажно тры медалі "За адвагу". Прычым кожны з іх дастаўся яму вельмі вялікай цаной — цаной уласнай крыві...

Сцюдзёнай снежаньскай ноччу 1943-га года байцы асобнага лыжнага батальёна, у састаў якога трапіў Аркадзь Накаў пасля накіравання на Ленінградскі фронт, адправіліся да прыгарада Гатчына, дзе заселі немцы. Задача байцоў заключалася ў тым, каб выбіць ворага адтуль.

Для многіх, у тым ліку і для Аркадзя, гэта заданне стала першым сур'ёзным выпрабаваннем.

Апранутыя ў белыя маскхалаты лыжнікі шпарка набліжаліся да нямецкіх траншэй і дзотаў. Стараліся рухацца ціха і бясшумна, каб застаць фрыцаў знянацку. Хоць нападзенне для тых і было поўнай нечаканасцю, здавацца без бою яны не збіраліся. Хутка цішыню ночы прарэзалі шматлікія кулямётныя чэргі, і часовая перадышка скончылася. Зноў палілася кроў сотняў салдатаў. Цэлыя суткі ўздрыгвала ад выбухаў зямля, снег з белага ператвараўся ў пунсова-чырвоны.

Для многіх навічкоў той першы бой стаў апошнім. Аркадзю Якаўлевічу пашанцавала — ён быў паранены, але застаўся жывы.

Ужо ў шпіталі А. Я. Накаў атрымаў свой першы медаль "За адвагу". А літаральна праз некалькі месяцаў яго ўзнагародзілі і другім медалём. Адбылося гэта ўжо калі Аркадзь Якаўлевіч служыў у разведроце 219 гвардзейскага стралковага палка.

Нейк шасцёра разведчыкаў адправіліся ноччу праз перадавую браць "языка".

(Заканчэнне на 4-й стар.)

ПРОГРАММА ТЕЛЕВИДЕНИЯ

ПОНЕДЕЛЬНИК, 8 мая

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Резонанс.
8.45 Потребительская корзина.
9.00, 15.00 Новости.
9.10 Худ.фильм «Мама, я живой!».
10.18 Видеозарисовка.
10.20 Телеочерк.
10.35 «Сегодня с вами...»
11.00 Телевизионный Дом кино.
11.40 «А музыка звучит...»
12.10 Теленавигатор.
12.30 «Радуница».
12.45 «Свет таланта».
13.25 «Мы победили!»
13.40 Фестиваль солдатской песни.
15.10 «Жизнь и несколько лет». Телеочерк.
15.30 док. фильм.
15.55 Торжественное заседание и концерт, посвященные Дню Победы.
18.00 АРТ-клуб.
18.45 док. фильм.
19.40 Музыкальная программа.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.35 Видеозарисовка.
21.40 Худ. фильм «В шесть часов вечера после войны».
23.10 Третий тайм.

ОРТ

7.00, 9.00, 14.00 Новости.
7.10 Слово пастыря.
7.25 «Все путешествия команды Кусто».
8.15 Программа «100%».
8.40 «Непутевые заметки».
9.10 Смак.
9.30 Пока все дома.
10.10 Комедия «Альф».
10.40 Утренняя почта.
11.10 «Летят журавли». Худ. фильм.
13.00 Фильм «Оккультные тайны Третьего рейха».
14.10 Время футбола.
14.40 «Господа офицеры». Концерт Олега Газманова.
16.55 Как это было. Знамя Победы. 1945 год.
17.35 Смехопанорама.
18.10 Худ. фильм «Белорусский вокзал».
20.00 Время.
20.45 Худ. фильм «Ожидание полковника Шалыгина».
22.25 Хоккей. Матч команд финальной группы.

РОССИЯ

7.00 У войны не женское лицо. Док. фильмы.
7.45 Почта РТР.
8.15 Доброе утро, страна.
8.50 Русское лото.
9.35 «Сто к одному».
10.25 Сам себе режиссер.
10.55 «Друзья». Телесериал.
11.20 Эх, дороги...
11.35 «Золотой ключ».
12.00, 19.00 Вести.
12.20 Федерация.
13.15 Героическая драма «Дважды рожденный».
14.45 «Том и Джерри». Мультсериал.
15.05 Планета Земля.
16.05 У войны не женское лицо. Док. фильм.
16.15 Памяти поэта. «Булату Окуджаве...»
16.55 Моя семья. «Он ищет ее».
17.55 «Два рояля».
19.40 «Павшие обелиски». Док. фильм. Часть 1-я.
20.10 «Аншлаг» и К°.
21.15 Мелодрама «Любовь земная».
23.00 Хоккей. Матч команд финальной группы.

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
7.15 Худ. фильм «Офицеры».
9.15 Худ. фильм «Выйти замуж за капитана».
11.30 Худ. фильм «А зори здесь тихие».
14.40 «Профессия — репортер».
15.20 Футбольный клуб.
16.10 Худ. фильм «Дело было в Пенькове».
18.35 «Победа. Одна на всех». Фильм из цикла «Новейшая история».
19.40 «О, счастливчик!»
21.45 Худ. фильм «Вор».
23.30 «Антропология».
0.15 Лига чемпионов.

МОГИЛЕВ-1

15.00 Торжественный вечер, посвященный 55-летию Победы.
16.40 «На графских развалинах». Фильм — детям.
17.45 Мультфильм.
17.55,19.45 «Праздник в Вашем доме».
19.20 Телемагазин.
19.30 «Встреча на Солдатской поляне».
20.45 «Сочинение ко Дню Победы». Худ. фильм.
22.40 Астро-дайджест.
22.55 «В небе «ночные ведьмы»». Худ. фильм.

2- Й КАНАЛ

7.00 «Энергетический завтрак».
8.00-18.00 ТНТ.
18.00 «Победоносный голос верующего».
18.30 Док.фильм. «Могилев. Дни и ночи мужества».
19.30 «Поздравления».
20.15 «В гостях у бабки Агапки».
20.30 «Поздравления».
21.20 Высокая мода.
21.30 Худ.фильм «Гу-га».
23.40 Спорт. программа.

ВТОРНИК, 9 мая

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 День Победы. Память.
8.15 Фильм-концерт.
8.40 Видеозарисовка.
8.45 День Победы. Память.
9.00, 13.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.15 Арсенал.
9.40 Парад Победы.
9.55 Военный парад и торжественное шествие ветеранов Великой Отечественной войны.
11.30 «Девочка ищет отца». Худ. фильм.
13.25 «Нам песня помогала на войне...»
14.25 «Один из многих». Док. фильм .
14.45 День Победы. Память.
15.20 Видеозарисовка.
15.25 «Полонез Огинского». Худ. фильм.
16.50 «55 лет Победы. Память сквозь годы». Видеозарисовка.
17.30 День Победы. Память.
17.50 «Светлой памяти павших в борьбе против фашизма». Минута молчания.
18.05 Худ. фильм «Баллада о солдате».
19.30 Стихи белорусских поэтов о войне.
19.40 День Победы. Память.
20.00 Панорама. Репортаж о военном параде и торжественном шествии ветеранов, посвященных 55-летию Победы.
21.55 Международный телефестиваль патриотической песни «Память».

ОРТ

6.00, 14.00, 17.00 Новости.
6.10 Телеканал «День Победы».
6.25 «Бессмертный гарнизон». Телесериал.
8.00 «День Победы».
9.00 Москва. Красная площадь. Военный парад.
9.55 Играй, гармонь любимая!»
10.25 1941: «Разгром».
11.10 «День Победы».
11.45 1942: «Сталинград». Телесериал.
12.35 «День Победы».
13.10 1943: «Курская битва». Телесериал.
14.15 «Поезд милосердия». Док. фильм.
14.50 «День Победы».
15.35 1944: «Минское кольцо». Телесериал.
16.20 Ищу тебя.
17.15 «День Победы».
17.50 «Светлой памяти павших в борьбе против фашизма». Минута молчания.
18.05 1945: «Штурм Берлина. Победа». Телесериал.
19.35 А. Маресьев в программе «ЖЗЛ».
20.00 Время.
20.40 Фильм Л.Быкова «В бой идут одни старики».
22.10 Хоккей. Матч команд финальной группы.

РОССИЯ

7.00 Мультфильм.
7.10 Док. фильм.
7.35 «Голоса войны». Музыкальный фильм.
9.00 Москва. Красная площадь. Военный парад.
9.55 «Виктория». Фестиваль солдатской песни.
12.00, 19.00 Вести.
12.20 Романтическая драма «Чистое небо».
14.10 Новая «Старая квартира».
15.15 Ко Дню Победы. Киноконцерт.
16.00, 18.05 Кинороман «Судьба».
17.50 «Светлой памяти павших в борьбе против фашизма». Минута молчания.
19.40 «Павшие обелиски». Док. фильм. Часть 2-я.
20.10 А. Розенбаум. Праздничный концерт.
22.10 Киноэпопея «Падение Берлина».

НТВ

7.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
7.15 Олег Даль в фильме «Женя, Женечка и «катюша».
8.50 Военный парад, посвященный 55-летию Победы.
9.40 «Песни о Москве».
10.20 «Один день».
11.30 Худ. фильм «Картуш».
13.25 Худ. фильм «На войне как на войне».
15.25 «Я и моя собака».
16.10 «В нашу гавань заходили корабли».
17.50 «Светлой памяти павших в борьбе против фашизма». Минута молчания.
18.40 Худ. фильм «Сочинение ко Дню Победы».
20.35 «Профессия — репортер».
21.35 Футбол. Лига чемпионов. Полуфинал. «Бавария» (Германия) — «Реал» (Испания).
23.35 Худ. фильм «Домой дороги нет» (США).

МОГИЛЕВ-1

15.00 «Родительский день — день просветления и памяти».
15.20 Мультфильмы.
16.10 «Битва за Берлин». Док. сериал. 1 часть.
17.00 Телеочерк.
17.35 «С праздником Вас, Победители!»
18.20 «Битва за Берлин». Док. сериал. 2 часть.
19.15 Телемагазин.
19.30 День области.
19.50 «Праздник в Вашем доме».
20.45 «Командир счастливой «Щуки». Х/ф.
22.25 Астро-дайджест.
22.35 «Торпедоносцы». Худ. фильм.

2-Й КАНАЛ

7.00 «Энергетический завтрак».
8.00-17.00 ТНТ.
17.00 «Поздравления».
18.00 «Победоносный голос верующего».
18.30 «Поздравления».
19.30 Док.фильм «Парад Победы».
20.20 Мультфильмы.
20.30 Муз. программа.
21.10 Высокая мода.
21.20 Худ.фильм «В бой идут одни старики».
22.45 Спорт. программа.

СРЕДА, 10 мая

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.05 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.15 «Сегодня с вами...»
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.40 «На волне взаимопонимания».
10.25 «Зорная ростань».
11.20 Х/ф. «Свет в окне».
12.35 Компьютерный полигон.
14.25 «Карамболь».
15.15 Видеокурс английского языка.
15.35 Мультфильм.
15.45 «5 x 5».
16.15 ТВ — школе.
16.40 Телеочерк.
17.10 «Макаенка,9».
17.40 Музыкальный салон.
18.10 «Сегодня с вами...»
18.35 Лотерея «Толока».
18.45 МСН.
19.15 Москва — Минск.
19.50 «Майор Вихрь». худ. фильм. 1-я серия.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 КВН.
23.30 Криминальная хроника.
23.35 Королевская охота.
0.15 «Неизвестный Наполеон». Видеофильм.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.45 Новости.
8.15 «Нежный яд».
9.15 Поле чудес.
10.15 Смак.
10.30 «Новые приключения Синдбада».
13.20 «Вместе».
14.15 «Невероятные приключения Джонни Квеста».
14.40 Классная компания.
14.55 Звездный час.
15.25...До шестнадцати и старше.
16.00 «Нежный яд».
17.30 Маски-шоу.
18.00 Человек и закон.
18.45 Боевик «Крутые». 1-я серия.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Комедия. «Плезантвиль».
23.10 «Цивилизация».

РОССИЯ

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
5.20 — 8.30 Доброе утро, Россия.
5.35 Семейные новости.
7.20 «Дежурная часть».
8.40 «Арена — спорт».
9.20 «Цыганка».
10.10 «Санта-Барбара».
11.00 Телеспецназ.
11.25 Москва — Минск.
15.40 Мультфильмы.
16.30 «Башня».
16.55 «Круглая дата».
17.25 «Кинескоп».
18.25 «Вино-шоу-кур».
19.40 «Дикий ангел».
20.35 Приключенческий фильм «Мужская компания».
22.30 Мужчина и женщина.
23.20 Драма «Французская женщина».
1.05 «Дежурная часть».

НТВ

5.00 «Сегодня утром».
7.55 «Я и моя собака».
8.45 Фитиль.
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.25 «Победа. Одна на всех».
10.25 «Свидетель века».
10.40 «Среда».
11.30 Телеигра.
12.40 Мультфильм.
13.35 Муз. комедии «Вольный ветер». 1-я серия.
15.35 Сериал «Лоис и Кларк».
16.30 Впрок.
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 Сериал «Бандитский Петербург».
19.55 Суд идет.
21.35 Футбол. Лига чемпионов. Полуфинал. «Барселона» — «Валенсия».

МОГИЛЕВ-1 на БТ

13.15 «Встреча на Солдатской поляне».
13.25 «Родительский день — день просветления и памяти».
13.40 Телеочерк.
14.10 Мультфильм.

МОГИЛЕВ-1

6.30,7.10 «Ранехонько!»
7.00 «Астро-дайджест».
8.05 «Искушение».
8.55 «Удивительные животные». Док. сериал.
9.20 «Командир счастливой «Щуки»». Худ.фильм.
16.30 «Диагноз: убийство». Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 Тележурнал.
18.00, 20.00 «Праздник в Вашем доме».
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.45 «Только ты». Телесериал.
21.30 Астро-дайджест.
21.40 Спорт планеты.

2-Й КАНАЛ

7.00 «Энергетический завтрак».
8.10-12.00 ТВ-6.
15.00 ТВ на польском.
18.00 «Победоносный голос верующего».
18.30 Городские новости.
18.45 Док. фильм.
19.10 Мультфильм.
19.30, 20.30 «Поздравления».
20.15 «В гостях у бабки Агапки».
21.20 Высокая мода.
21.30 Городские новости.
